ДЭПАРТАМЕНТ ПА АРХІВАХ І СПРАВАВОДСТВУ
МІНІСТЭРСТВА ЮСТЫЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ АРХІЎ БЕЛАРУСІ

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ

# БЕЛАРУСКІЯ АРХІВЫ НА МЯЖЫ ТЫСЯЧАГОДДЗЯЎ: ЗДАБЫТКІ І СТРАТЫ

Матэрыялы навукова-практычнай
канферэнцыі, прысвечанай 80-годдзю
Нацыянальнага гістарычнага
архіва Беларусі

(Мінск, 28 чэрвеня 2018 г.)

Мінск
БелНДІДАС
2019

УДК 930.25(476)(082)
ББК 79.3(4Беи)я43
Б43

Р э д а к ц ы й н а я к а л е г і я:
*В. І. Кураш* (старшыня)*, А. А. Каваленя, В. Ф. Голубеў, В. В. Даніловіч, А. Б. Доўнар, Д. В. Лісейчыкаў, Д. Ч. Матвейчык, Д. У. Яцэвіч*

Р э ц э н з е н т ы:
кандыдат гістарычных навук *А. Я. Рыбакоў*
кандыдат гістарычных навук *М. Ф. Шумейка*

ISBN 978-985-7131-29-7

© Дзяржаўная ўстанова «Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі», 2019
© Афармленне. Дзяржаўная навуковая ўстанова «Беларускі навукова-даследчы інстытут дакументазнаўства і архіўнай справы», 2019

клерыка]. У год ад Нараджэння Пана [тысяча пяцьсот дванаццатага], [пятнаццатага] індыкту, [у аўторак дзявятага лістапада], у [дзявяты] год найсвяцейшага пана нашага, пана [Юлія другога], з Божага Провіду Папы.

Крыніцы і літаратура


1. Францыск Скарына: Зборнік дакументаў і матэрыялаў / Прадм., уклад., камент., паказ. В. І. Дарашкевіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1988. – 349 с.
2. Acta graduum academicorum Gymnasii Patavini. III. 1. Ab anno 1501 ad annum 1525 / A cura di E. Martellozzo Forin. – Padova : Editrice Antenore, 1969. – 447 p.
3. Acta graduum academicorum Gymnasii Patavini. II. 3. Ab anno 1471 ad annum 1500 / A cura di E. Martellozzo Forin. – Roma ; Padova : Editrice Antenore, 2001. – 268 p.


Д. В. Лісейчыкаў

## МАТЭРЫЯЛЫ ГЕНЕРАЛЬНЫХ ВІЗІТАЦЫЙ МАНАСТЫРОЎ ЛІТОЎСКАЙ ПРАВІНЦЫІ БАЗЫЛЬЯНСКАГА ОРДЭНА XVIII ст. У ФОНДАХ АЎСТРЫЙСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БІБЛІЯТЭКІ

Матэрыялы генеральных візітацый храмаў розных хрысціянскіх канфесій з'яўляюцца надзвычай важнай гістарычнай крыніцай. З дапамогай іх можна вывучаць практычна ўсе аспекты канфесійнай, сацыяльнай, эканамічнай гісторыі, праводзіць даследаванні архітэктуры, іканапісу, кнігаабмену, тапанімікі, генеалогіі, архіўнай справы і інш. Асаблівую цікавасць уяўляюць дакументы базыльянаў – адзінага ў Вялікім Княстве Літоўскім каталіцкага ордэна ўсходняга абраду, які ў XVIII ст. меў тут найбольшую ў параўнанні з іншымі ордэнамі колькасць манастыроў.

Паколькі храмы за перыяд з XVII па XX стст. не раз мянялі адміністрацыйную падпарадкаванасць – мяняліся межы епархій, ордэнскіх правінцый і нават дзяржаў, мелі месца неаднаразовыя канфесійныя канверсіі адных і тых жа культавых будынкаў – матэрыялы генеральных візітацый па беларуска-літоўскіх землях апынуліся ў сховішчах самых розных дзяржаў. Не выклікаюць здзіўлення знаходкі матэры-

ялаў базыльянскіх візітацый ВКЛ у архівах Беларусі, Украіны, Літвы, Польшчы, Расіі і нават Ватыкана. Тым не менш, для беларускай навуковай грамадскасці застаюцца практычна невядомымі 5 кніг генеральных візітацый манастыроў Літоўскай правінцыі базыльянскага ордэна з 1736 па 1798 гг., якія захоўваюцца ў фондах Аўстрыйскай нацыянальнай бібліятэкі ў Вене [1; 2; 3; 4; 5].

Частка з іх утрымлівае старыя сігнатуры і некаторыя правененцыі, якія могуць праліць святло на перамяшчэнні гэтых кніг у XVIII–XX стст. Так, усе яны ўтрымліваюць адну альбо дзве старыя нумарацыі, якія былі нададзены ў папярэдніх архівасховішчах.

- Кніга № 2798 (1785–1788 гг.) мае старую сігнатуру «4734 13» (на карэньчыку вокладкі).
- Кніга № 2799 (1742–1747 гг.) мае старыя сігнатуры «F.F.F. Nr. 6» (на першых аркушах), «F. 6» і «4727 6» (на карэньчыку вокладкі).
- Кніга № 3847 (1736–1742 гг.) мае старыя сігнатуры «F.F.F. Nr. 5» (на першых аркушах), «F. 5» і «4727 5» (на карэньчыку вокладкі).
- Кніга № 3848 (1751–1755 гг.) мае старыя сігнатуры «F.F.F. Nr. 8» (на першых аркушах) і «4728 7» (на карэньчыку вокладкі).
- Кніга № 3849 (1793–1798 гг.) мае старую сігнатуру «4776 55» (на карэньчыку вокладкі).

Апрача гэтага, на кнізе № 2799 маецца кірылічны надпіс простым алоўкам «См. 5/III 91 г.» [2, p. 1]. Гэта сведчыць аб тым, што 5 сакавіка 1891 г. кніга падвяргалася праверцы падчас знаходжання ў нейкім архіве (бібліятэцы) на тэрыторыі Расійскай імперыі. На гэта паказвае і спіс назваў манастыроў на рускай мове дарэформенным правапісам, складзены ў канцы XIX – пачатку XX ст., які папярэднічае тэксту візітацый [2, p. 1 v.]. Падобны надпіс маецца і на кнізе № 3847 – «См. 7 апр. 91 г.» [3, p. 1].

На нашу думку, найбольш верагодным месцам захавання кніг у канцы XVIII – пачатку XX ст. быў базыльянскі манастыр у Белай (сёння г. Бяла-Падляска ў Польшчы). Гэты невялікі радзівілаўскі горад былога Брэсцкага павета Вялікага Княства Літоўскага ў 1795–1809 гг. знаходзіўся ў складзе Аўстрыйскай імперыі, у 1809–1815 гг. – у складзе Герцагства Варшаўскага, з 1815 па 1915 гг. уваходзіў у склад Расійскай імперыі і адносіўся да Царства Польскага. Асаблівасцю гэтых тэрыторый у складзе Расійскай імперыі было тое, што структуры Уніяцкай Царквы тут былі ліквідаваны не ў 1839 г., а ў 1875 г.

Да 1864 г. у Белай дзейнічаў базыльянскі манастыр, дзе найверагодней знаходзіліся, прынамсі, 3 кнігі візітацый. Рызыкнём высунуць версію, што нумарацыя 3-х кніг «F.F.F. Nr. 5», «F.F.F Nr. 6» і «F.F.F. Nr. 8» – гэта ўліковыя звесткі звязак (фасцыкулаў) бельскага архіва. Больш позняя сігнатура, якая маецца на ўсіх 5-ці кнігах і пачынаецца з лічбаў «47…», – гэта ўліковая нумарацыя нейкага венскага архівасховішча ці бібліятэкі перыяду Першай сусветнай вайны альбо першых пасляваенных гадоў. Трапіць у Вену кнігі маглі падчас гучнай даследчай археалагічнай спецаперацыі аўстрыйскіх улад 1916 г. па адшуканні ў былой бельскай базыльянскай царкве схаваных рэліквій Св. Іасафата, якія знаходзіліся пры царкве яшчэ з 60-х гг. XVIII ст. У 1916 г. яны былі ўрачыста перавезены з Белай у Вену. На нашу думку, разам з рэліквіямі ў сталіцу Аўстрыі была перавезена і захаваная частка архіва былога базыльянскага манастыра.

У свой час гэтыя кнігі ўжо рабіліся аб’ектам падрабязнага разбору і вывучэння. У 1979 г. у многім на іх падставе зрабіў спробу рэканструкцыі адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу ордэна ў XVII–XVIII стст. рымскі манах-базыльянін украінскага паходжання Міхайла Ваўрык [6]. Захаваныя матэрыялы паказваюць, што складзеная намі ў 2012 г. карта адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу структур Уніяцкай Царквы ў XVII–XVIII стст. у пытанні вызначэння межаў Літоўскай правінцыі базыльянскага ордэна, з’яўляецца няпоўнай [9]. Так, манастыры ў Супраслі і Кузніцы знаходзіліся па-за правінцыйным кіраваннем. Затое да складу Літоўскай правінцыі ў сярэдзіне XVIII ст. адносіўся цэлы шэраг манастыроў на тэрыторыі сённяшніх Украіны (Бучач, Вярхі, Дарагабуж, Дзермань, Дубна, Жыдзічын, Уладзімір) і Польшчы (Белая, Гарадок, Люблін, Турковічы, Холм) (гл. дадатак 2). На складзенай намі ў 2012 г. карце таксама адсутнічаюць малавядомыя манастыры ў Лепясах (наяўнасць толькі адной візітацыі 1737 г.), Лукомлі, Любавічах, Пустынках Віцебскіх і Скітку (наяўнасць толькі адной візітацыі 1755 г.). Апрача гэтага, да Літоўскай правінцыі належаў і базыльянскі манастыр у Рыме.

Разгледзім некаторыя асаблівасці пісьмовай фіксацыі вынікаў візітацый, якія практыкаваліся ў той час. Як правіла, пратакол візітацыі складаўся ў двух асобніках. Першы, арыгінальны, заносіўся ў адмысловую кнігу, другі, капійны, пакідаўся на месцы, у манастыры. У манастырскіх архівах такія капійныя пратаколы нярэдка падшываліся ў асобную адзінку захавання, што дае магчымасць убачыць

наколькі часта ў мінулым манастыр падлягаў візітацыям. Да нашага часу цалкам захавалася толькі 1 падобная кніга – манастыра ў м. Вольна Навагрудскага павета [10]. У ёй знаходзяцца пратаколы візітацый Вольнаўскага манастыра за 1675, 1704, 1723 і 1726 гг. Вядома, што манастыр быў заснаваны ў 1630-х гг. і ад самага пачатку быў падпарадкаваны ўніяцкай юрысдыкцыі. Такім чынам, да 1675 г. вынікі яго візітацыі, верагодна, у пісьмовай форме не фіксаваліся. У цэлым гэта суадносіцца з агульнай сітуацыяй ва ўсёй уніяцкай Кіеўскай мітраполіі – першыя суцэльныя генеральныя візітацыі з абавязковай пісьмовай фіксацыяй тут пачалі праводзіцца толькі з 1680-х гг. [7]. У першай чвэрці XVIII ст. частаму правядзенню візітацый перашкаджалі падзеі Паўночнай вайны. Да нашага часу дайшла кніга візітацыі ўсіх манастыроў Літоўскай правінцыі за 1704–1705 гг. [8], і мы можам бачыць, што тэкст візітацыі вольнаўскага манастыра ад 1 снежня 1704 г. у арыгінальным і капійным пратаколах супадае слова ў слова. Цікавым з'яўляецца той факт, што вольнаўская кніга ўтрымлівае дакументы да 1780-х гг., аднак капійных пратаколаў візітацый пазней за 1726 г. у ёй няма. Хоць у кнізе мімаходзь узгадваецца, што ў 1730–1740-х гг. візітатары ўсё ж сюды заязджалі. З кніг Аўстрыйскай нацыянальнай бібліятэкі становіцца вядома, што Вольнаўскі манастыр упоравень з астатнімі наведваўся візітатарамі ў 1736, 1738, 1739, 1743, 1745, 1752, 1753, 1754, 1785, 1787, 1788, 1795, 1797 і 1798 гг. (гл. дадатак 1).

Фармуляры пратаколаў візітацый за розныя гады істотна адрозніваюцца паводле паўнаты і формы. Абсалютная большасць тэксту пратаколаў 1730–1750-х гг. з аўстрыйскіх збораў прысвечана апісанню асабовага складу: манахам, навіцыям, студэнтам, манастырскім служкам.

Сярод апісанняў насельнікаў маюцца пазначэнні роду іх занякаў, што дае выдатную магчымасць вывучаць самыя розныя аспекты дзейнасці манастыра. Так, напрыклад, можна даведацца пра поўны склад музыкантаў манастыра ў м. Баруны Ашмянскага пав. за 1737 г. – 6 чалавек: 1 арганіст, 2 трубачы і габаісты, 1 скрыпач і тэнар, 1 альт і 1 дыскант [3, арк. 168 адв.]; у г. Вільні за 1739 г. – 8 чалавек: 1 арганіст, 1 валтарніст, 1 трубач, 1 вучань, 2 альты і 2 дысканты [3, арк. 163 адв.].

Вялікую цікавасць уяўляюць спісы навіцыяў з пазначэннем іх паходжання. Адзначаўся ўзрост навіцыя, веравызнанне яго бацьм

коў і месца нараджэння. Напрыклад, у 1736 г. з 23 навіцыяў манастыра ў м. Быцень Слонімскага павета бацькі ў 12 былі ўніятамі, у 10 – рыма-каталікамі, у 1 – праваслаўнымі [3, арк. 33 адв.–34 адв.]. Узрост – ад 17-ці да 33-х гадоў. Навіцый праваслаўнага паходжання Макарый Какоўскі быў родам з сербскага горада Петраварадзіна. У 1740 г. мы сустракаем гэтага ж чалавека ўжо ў якасці манаха ў манастыры Св. Сафіі ў г. Полацку [3, арк. 141 адв.], а ў 1741–1744 гг. адзначаны і яго род заняткаў у манастыры – *sculptor* (скульптар альбо разбяр) [2, арк. 103; 3, арк. 145]. Менавіта ў гэты час у горадзе на сродкі полацкага архіепіскапа Фларыяна Грабніцкага праходзіла адбудова кафедральнай саборнай царквы Св. Сафіі. З 1750 г. Макарый Какоўскі ў якасці скульптара ўжо адзначаны ў ліку насельнікаў манастыра ў м. Жыровічы Слонімскага павета [4, арк. 146 адв.].

Спісы дробных манастырскіх служак таксама могуць змяшчаць карысную інфармацыю. Напрыклад, візіты манастыра Св. Сафіі ў Полацку за 1740 і 1741 гг. утрымліваюць звесткі аб памочніку мастака Адрыяне Баршчэўскім і манастырскім вартаўніку-брамніку Рыгоры Баршчэўскім [3, арк. 141 адв., 144 адв.], верагодных продках знакамітага ў XIX ст. пісьменніка Яна Баршчэўскага.

Вялікі тэрытарыяльны і храналагічны ахоп захаваных пратаколаў дае магчымасць прасачыць этапы кар'еры многіх прадстаўнікоў духавенства, істотна дапоўніць біяграфічныя звесткі нават пра прадстаўнікоў вышэйшай іерархіі – аж да епіскапаў. Так, напрыклад, з пратакола візітацыі манастыра ў м. Быцень Слонімскага павета ад 20.10.1736 робяцца вядомымі звесткі пра раннія гады жыцця будучага ўладзімірска-брэсцкага епіскапа Антаніна Младоўскага. Згодна з дакументам, ён нарадзіўся ў 1720 г. у шляхецкай сям'і рымска-каталіцкага веравызнання з Ваўкавыскага павета і адбываў свой навіцыят у Быцені [3, арк. 34 адв.].

Пры некаторых манастырах існавалі навучальныя ўстановы. Матэрыялы генеральных візітацый даюць магчымасць вывучыць персанальны склад выкладчыкаў, а ў многіх выпадках і навучэнцаў гэтых устаноў. Так, яны ўтрымліваюць апісанні духоўнай семінарыі ў м. Свержань Мінскага павета, пералікі студэнтаў аддзялення філасофіі пры манастыры ў г. Віцебску, студэнтаў аддзяленняў філасофіі і тэалогіі пры манастыры Св. Сафіі ў г. Полацку, студэнтаў школы пры манастыры ў в. Ануфрыева Мсціслаўскага ваяводства, якая да пачат-

ку XIX ст. фактычна выконвала функцыі Полацкай епархіяльнай духоўнай семінарыі [4, арк. 329 адв., 344, 356, 414].

У візітах часта адзначаўся статус манастыра, які падлягаў праверцы. Гэта магла быць *архімандрыя* (абацтва), проста *манастыр*, *калегія* (манастыр, пры якім была школа альбо семінарыя). Самы нізкі статус мела *місія* – манастыр, пры якім жыло ўсяго некалькі манахаў і які не меў дастатковага фундуша і памяшканняў.

Мова складання ўсіх пратаколаў – лацінская. Маюцца толькі асобныя польскамоўныя ўстаўкі. Звычайна гэта характарыстыка манастырскіх служак з ліку свецкіх асоб.

Апрача ўласна пратаколаў візітацый, у кнігі падшыты спадарожныя дакументы, каштоўнасць і інфарматыўнасць якіх не менш значная. Так, кніга візітаў за 1742–1747 гг. [2, арк. 305–328 адв.] утрымлівае агульныя спісы ўсіх манахаў за 1745 г. пад зборнай назвай *Cathalogus Monasteriorum et Personarum*. Кніга за 1751–1755 гг. [4] – спісы манахаў асобна за 1752, 1753, 1754 і 1755 гг. пад зборнай назвай *Cathalogus Personarum*. Тут не толькі прадубліравана ў структураваным выглядзе інфармацыя аб манахах з тэкстаў візітаў, але пададзены яшчэ і спісы базыльянскіх навучэнцаў у Грэчаскім Калегіуме і Калегіуме Прапаганды Веры ў Рыме, у езуіцкім калегіуме г. Браўнсберга (Браневе), больш вядомым як *Collegium Hosianum*, Віленскім папскім алюмнаце. Маюцца звесткі і аб асістэнтах мітрапалітаў, а таксама аб судовых асістэнтах з уніяцкага боку ў Галоўным Трыбунале Вялікага Княства Літоўскага (генеральным пракуратары і 3-х віцэ-пракуратарах для віленскіх, мінскіх і навагрудскіх кадэнцый).

Трапляюцца ў кнігах і дакументы, падшытыя выпадкова. Гэта, напрыклад, пратакол генеральнай візітацыі жаночага манастыра ў в. Мазалава Віцебскага павета 1747 г. [2, арк. 273–274] альбо рашэнне генеральнага візітатара Парфірыя Скарбка-Важынскага па справе аб абвінавачванні манаха Лаўрышаўскага манастыра Андрэя Яновіча ў п'янстве за 1787 г. [1, арк. 379 – 379 адв.].

Для таго, каб мець дакладнае ўяўленне, якія канкрэтна дакументы і за якія гады ўтрымліваюць кнігі са сховішчаў Аўстрыйскай нацыянальнай бібліятэкі, мы склалі зводную табліцу з пазначэннем населеных пунктаў, у якіх існаваў манастыр, і года візітацыі (гл. дадатак 1). Таксама на падставе гэтых матэрыялаў была складзена карта Літоўскай правінцыі базыльянскага ордэна ў сярэдзіне XVIII ст. (гл. Дадатак 2).

Публікацыя кароткага каталога матэрыялаў генеральных візітацый манастыроў Літоўскай правінцыі базыльянскага ордэна 1736–1798 гг. будзе спрыяць іх далейшай паглыбленай распрацоўцы пры правядзенні гістарычных даследаванняў паводле самых розных накірункаў.

## Крыніцы і літаратура

1. Österreichische Nationalbibliothek (далей – ÖNB). Nr. 2798. – Visitationes Monasteriorum (O.S.B.M.) Provinciae Littuanae ab anno 1784 ad annum 1788 per Reverendissimum Patrem Porphyrium Skarbek Wazynski. – 547 p.
2. ÖNB. Nr. 2799. – Visitationes Monasteriorum (O.S.B.M.) a Reverendissimo Koniaczewski <…> peractarum ab anno 1742 usque ad Capitulum generale Brestense <…> 1747. Volumen Nr. 6. – 330 p.
3. ÖNB. Nr. 3847. – Visitationes Monasteriorum Ordinis S. Basilii. 1736–1741. – 292 p.
4. ÖNB. Nr. 3848. – Visitationes Monasteriorum Ordinis S. Basilii. 1751–1755. – 490 p.
5. ÖNB. Nr. 3849. – Visitationes Monasteriorum Ordinis S. Basilii. 1793–1798. – 491 p.
6. Ваврик, М.-М. Нарис розвитку і стану Василіянського Чина XVII–XX ст. : топографічно-статистична розвідка. – Рим, 1979. (Записи ЧСВВ : серія 2. Секція 1. Праці). – 219 с.
7. Візіты ўніяцкіх цэркваў Мінскага і Навагрудскага сабораў 1680–1682 гг. : зборнік дакументаў / Укладальнік Д. В. Лісейчыкаў. – Мінск : І. П. Логвінаў, 2009. – 270 с.
8. Институт российской истории Российской Академии наук. – Ф. 52 (Коллекция П. Н. Доброхотова). – Оп. 1. – Д. 328. – Генеральныя візітацыі манастыроў Літоўскай правінцыі базыльянскага ордэна. 1704–1705 гг. – 224 арк.
9. Лісейчыкаў, Д. В. Уніяцкая Царква ў XVII–XVIII стст. (карта) // Вялікі гістарычны атлас Беларусі ў 4-х тамах. – Т. 2. – Мінск, 2012. – С. 61.
10. НГАБ. – Калекцыя лічбавых копій № 17. – Воп. 1. – Спр. 1. – Інвентары інсталяцыі вольнаўскіх настаяцеляў, складзеныя ад 1675 да 1782 гг. – 102 арк.

## Захаванасць матэрыялаў генеральных візітацый манастыроў Літоўскай правінцыі базыльянскага ордэна 1736–1798 гг. у фондах Аўстрыйскай нацыянальнай бібліятэкі

| | 1736 | 1737 | 1738 | 1739 | 1740 | 1741 | 1742 | 1743 | 1744 | 1745 | 1746 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Антопаль, м. Брэсцкага пав. | - | + | - | - | + | + | + | + | + | - | + |
| Ануфрыева, в. Мсціслаўскага ваяв. | - | + | - | + | - | + | + | - | + | - | + |
| Баруны, м. Ашмянскага пав. | - | + | + | + | - | + | - | + | - | + | + |
| Белая, м. Брэсцкага пав. | - | + | + | + | + | + | - | - | - | - | - |
| Беразвеч, в. Полацкага ваяв. | + | - | - | - | - | + | - | + | - | - | - |
| Браслаў, г. Браслаўскага пав. | - | - | + | - | - | - | + | - | - | - | + |
| Брэст, г. Брэсцкага пав. | - | + | + | + | + | - | + | - | - | - | - |
| Бучач, в. Каралеўства Польскага (далей – КП) | - | - | + | - | - | - | - | - | - | - | + |
| Быцень, м. Слонімскага пав. | + | - | + | - | + | - | - | - | + | - | - |
| Вільня, г. Віленскага пав. | - | + | - | + | + | - | + | + | - | + | - |
| Віцебск, г. Віцебскага пав. | - | + | + | + | + | + | + | + | + | - | + |
| Вольна, м. Навагрудскага пав. | + | - | + | + | - | - | - | + | - | + | - |
| Вярхі, в. КП | - | + | - | - | - | - | - | - | - | - | + |
| Гарадок, м. КП | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - |

*Дадатак 1*

| 1747 | 1751 | 1752 | 1753 | 1754 | 1755 | 1785 | 1786 | 1787 | 1788 | 1793 | 1794 | 1795 | 1796 | 1797 | 1798 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| - | - | + | + | + | + | - | + | + | + | + | - | + | - | + | - |
| + | - | + | + | + | + | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - |
| - | - | + | + | + | + | + | + | + | - | - | + | - | + | + | + |
| + | - | + | + | + | + | - | + | - | + | + | - | + | - | - | - |
| - | - | + | + | - | + | + | + | + | - | + | - | + | + | - | - |
| - | - | + | - | + | - | + | + | + | - | + | - | - | - | + | - |
| - | - | + | + | + | + | - | + | - | + | + | - | + | - | + | - |
| - | - | + | + | + | + | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - |
| - | - | + | + | + | + | + | + | + | + | - | - | + | + | + | + |
| - | - | + | + | + | + | + | + | + | - | - | + | - | - | + | + |
| + | - | + | + | + | + | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - |
| - | - | + | + | + | - | + | - | + | + | - | - | + | - | + | + |
| - | - | + | + | + | + | - | + | - | + | + | - | + | - | - | - |
| - | - | + | + | + | + | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - |

| | 1736 | 1737 | 1738 | 1739 | 1740 | 1741 | 1742 | 1743 | 1744 | 1745 | 1746 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Гелянова, в.<br>Браслаўскага пав. | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - |
| Глушні, в.<br>Лідскага пав. | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | + |
| Голдава, в.<br>Лідскага пав. | - | + | - | - | - | - | - | - | - | - | + |
| Гродна, г.<br>Гродзенскага пав.<br>(Каложскі) | - | + | - | - | - | - | - | - | + | - | - |
| Дабрыгоры, в.<br>Полацкага ваяв. | - | + | + | + | + | + | + | - | + | - | + |
| Дарава, м.<br>Навагрудскага пав. | + | - | - | + | - | + | - | - | + | + | - |
| Дарагабуж, м.<br>КП | - | - | + | + | - | + | - | - | - | + | + |
| Дарагічын, г.<br>КП | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - |
| Дзермань, в.<br>КП | - | + | + | + | - | + | + | + | - | + | + |
| Дубна, м.<br>КП | - | + | + | + | - | + | + | - | - | + | + |
| Жыдзічын, м.<br>КП | - | + | + | + | - | + | + | + | + | + | + |
| Жыровічы, м.<br>Слонімскага пав. | + | + | + | + | + | + | - | + | - | + | - |
| Ілукшта, м.<br>у Курляндыі | - | - | + | - | - | - | + | - | - | - | + |
| Казімірава, м.<br>Рэчыцкага пав. | - | + | - | + | - | - | - | - | + | - | + |
| Камянец, м.<br>Брэсцкага пав. | - | + | - | + | - | - | - | - | + | + | - |
| Касута, в.<br>Ашмянскага пав. | - | - | - | + | + | - | - | - | - | + | - |
| Кобрын, г.<br>Брэсцкага пав. | - | + | - | - | - | - | + | - | + | + | + |

| 1747 | 1751 | 1752 | 1753 | 1754 | 1755 | 1785 | 1786 | 1787 | 1788 | 1793 | 1794 | 1795 | 1796 | 1797 | 1798 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| - | - | - | - | - | - | + | + | - | - | + | - | - | - | + | - |
| - | + | - | + | + | - | + | + | + | - | - | + | - | - | + | - |
| - | - | - | + | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - |
| - | + | - | + | - | - | + | + | + | - | - | + | - | + | + | - |
| + | - | + | + | + | + | + | + | + | - | + | - | + | - | - | - |
| - | - | + | + | + | - | + | - | + | - | - | + | + | - | + | + |
| - | - | + | + | + | + | - | + | - | + | - | - | - | - | - | - |
| - | - | - | - | - | - | - | + | - | + | + | - | + | - | - | - |
| - | - | - | - | + | - | - | + | - | + | + | - | - | - | - | - |
| - | - | + | + | - | - | - | + | - | + | + | - | + | - | - | - |
| - | - | + | + | + | + | - | + | - | - | + | - | + | - | - | - |
| - | - | + | + | + | + | + | - | + | + | - | + | - | + | + | + |
| - | - | + | - | + | - | + | - | + | - | + | - | - | - | + | + |
| - | - | + | - | - | + | + | + | + | - | - | + | + | - | - | - |
| - | - | + | + | - | + | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - |
| - | - | + | + | + | + | + | + | + | - | + | - | + | + | - | - |
| - | - | + | + | + | + | - | + | + | + | + | - | + | - | + | - |

| | 1736 | 1737 | 1738 | 1739 | 1740 | 1741 | 1742 | 1743 | 1744 | 1745 | 1746 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Лагойск, м. Мінскага пав. | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - |
| Лаўрышава, в. Навагрудскага пав. | + | - | + | - | + | + | + | + | - | + | + |
| Лепясы, в. Брэсцкага пав. | - | + | - | - | - | - | - | - | - | - | - |
| Лешча, м. Пінскага пав. | - | + | - | - | - | - | - | + | - | - | - |
| Лукомль, м. Аршанскага пав. | - | + | - | - | - | - | - | - | + | - | + |
| Лыскаў, м. Ваўкавыскага пав. | - | + | + | - | + | + | - | + | + | - | - |
| Любавічы, м. Аршанскага пав. | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - |
| Люблін, г. КП | - | - | - | + | - | - | - | - | - | - | - |
| Ляды, в. Мінскага пав. | - | - | - | + | - | - | - | + | - | + | - |
| *Мазалава, в. Віцебскага пав. (жаночы, упісаны памылкова)* | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - |
| Мазыр, г. Мазырскага пав. (Яснагорскі) | - | - | - | + | - | - | - | - | - | - | + |
| Малашкавічы, в. Мсціслаўскага ваяв. | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - |
| Марывіль, в. Мсціслаўскага ваяв. | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - |
| Махірова, в. Полацкага ваяв. | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - |
| Мінск, г. Мінскага пав. | + | - | + | - | - | - | + | + | - | + | - |
| Мір, м. Навагрудскага пав. | + | - | + | + | - | + | - | - | + | + | - |

| 1747 | 1751 | 1752 | 1753 | 1754 | 1755 | 1785 | 1786 | 1787 | 1788 | 1793 | 1794 | 1795 | 1796 | 1797 | 1798 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| - | - | - | - | - | - | + | + | + | - | + | - | + | + | - | - |
| - | - | + | - | + | - | + | + | + | + | - | - | + | + | + | - |
| - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - |
| - | - | + | - | + | + | - | + | - | + | + | - | + | + | - | - |
| + | - | + | - | + | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - |
| - | + | + | + | + | - | + | + | + | - | + | + | - | + | + | + |
| - | - | + | + | + | + | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - |
| - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - |
| - | - | + | + | + | - | + | + | - | - | + | + | + | + | - | - |
| + | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - |
| - | - | + | - | - | + | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - |
| - | - | - | + | - | + | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - |
| - | + | - | + | - | + | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - |
| - | - | + | + | + | + | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - |
| + | - | + | + | + | - | + | + | - | - | + | + | + | - | - | - |
| - | - | + | + | + | - | + | - | + | - | - | - | + | - | + | - |

| | 1736 | 1737 | 1738 | 1739 | 1740 | 1741 | 1742 | 1743 | 1744 | 1745 | 1746 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Навагрудак, г. Навагрудскага пав. | - | - | + | - | + | + | - | + | - | - | - |
| Навасёлкі, в. Брэсцкага пав. | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - |
| Новы Двор, в. Пінскага пав. | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - |
| Новы Свержань, м. Навагрудскага пав. | - | - | - | - | - | - | - | + | - | - | - |
| Падубіс, м. Жамойцкага княства | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - |
| Паставы, м. Ашмянскага пав. | - | + | - | - | + | - | - | - | - | - | - |
| Полацк, г. Полацкага ваяв. (Св.Барыса і Глеба альбо Бельчыцкі) | - | + | + | - | + | + | - | - | - | - | - |
| Полацк, г. Полацкага ваяв. (Св.Сафіі альбо Замкавы) | - | + | - | + | + | + | - | - | + | - | - |
| Пустынкі, в. Віцебскага пав. (Віцебскія Пустынкі) | - | + | + | + | + | - | + | - | + | - | + |
| Пустынкі, в. Мсціслаўскага ваяв. (Мсціслаўскія Пустынкі) | - | + | - | + | + | + | + | + | + | - | + |
| Рагачоў, м. Рэчыцкага пав. | - | + | - | + | - | - | - | - | + | - | + |
| Ракаў, м. Мінскага пав. | - | - | + | - | - | - | - | + | - | - | - |
| Ружаны, м. Слонімскага пав. | - | + | + | - | - | - | - | + | + | - | + |

| 1747 | 1751 | 1752 | 1753 | 1754 | 1755 | 1785 | 1786 | 1787 | 1788 | 1793 | 1794 | 1795 | 1796 | 1797 | 1798 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| - | - | + | + | + | + | + | + | + | - | - | - | + | + | + | - |
| - | - | - | - | - | - | - | + | + | - | + | + | + | - | + | - |
| - | - | + | - | - | - | - | + |  | - | + | - | + | - | - | - |
| - | - | + | + | + | - | + | + | + | + | - | - | + | + | - | - |
| - | - | - | - | - | - | + | + | + | - | - | - | - | + | + | + |
| - | - | + | - | - | - | + | - | - | - | + | - | - | + | - | - |
| - | - | + | + | + | + | + | + | + | - | + | - | + | + | - | - |
| - | - | + | + | + | + | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - |
| + | - | - | + | + | + | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - |
| + | - | + | + | + | + | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - |
| - | - | + | - | - | + | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - |
| - | - | + | + | + | - | + | + | + | - | + | + | + | + | - | - |
| - | + | + | + | + | - | + | + | + | - | + | + | - | + | + | + |

| | 1736 | 1737 | 1738 | 1739 | 1740 | 1741 | 1742 | 1743 | 1744 | 1745 | 1746 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Сіроціна, м. Полацкага ваяв. | - | - | + | - | + | + | - | - | - | - | - |
| Скіток, в. Рэчыцкага пав. | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - |
| Сухавічы, в. Мазырскага пав. | - | + | - | + | - | - | - | - | - | - | + |
| Суцькаў, в. Ашмянскага пав. | - | - | - | - | - | + | - | + | - | + | - |
| Сялец, в. КП (Брагіна-Сялецкі) | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | + |
| Тадуліна, в. Віцебскага пав. | - | - | - | - | - | - | - | - | + | - | + |
| Таракань, в. Брэсцкага пав. | - | + | - | - | + | + | - | + | - | - | - |
| Турковічы, в. КП | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | + |
| Уладзімір, г. КП | - | - | + | - | - | + | - | + | + | + | - |
| Ушачы, м. Полацкага ваяв. | - | + | + | + | + | + | + | - | - | - | + |
| Холм, г. КП | - | + | + | + | + | - | + | - | + | + | + |
| Хомск, м. Пінскага пав. | - | + | - | + | + | + | - | + | - | + | + |
| Цапра, в. Навагрудскага пав. | + | + | - | + | + | + | - | - | + | + | - |
| Чарлёна, в. Гродзенскага пав. | - | + | - | - | - | - | - | - | + | - | + |
| Чарэя, м. Аршанскага пав. | - | + | + | - | + | + | + | - | + | - | + |
| Якабштадт, м. у Курляндыі | - | - | + | - | - | - | + | - | - | - | + |
| Ятвеск, в. Ваўкавыскага пав. | - | + | + | - | - | - | - | + | + | - | + |

| 1747 | 1751 | 1752 | 1753 | 1754 | 1755 | 1785 | 1786 | 1787 | 1788 | 1793 | 1794 | 1795 | 1796 | 1797 | 1798 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| - | - | - | + | - | + | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - |
| - | - | - | - | - | + | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - |
| - | - | + | - | - | + | + | + | + | - | - | + | + | - | - | - |
| + | - | + | - | + | + | + | + | + | - | - | + | - | + | + | + |
| - | - | + | - | - | + | + | + | + | - | - | + | + | - | - | - |
| + | - | - | + | + | + | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - |
| - | - | - | - | - | - | - | + | - | + | - | - | - | - | - | - |
| - | - | - | - | - | - | - | + | - | + | + | - | + | - | - | - |
| - | - | + | + | + | + | - | + | - | + | + | - | - | - | - | - |
| - | - | + | + | + | - | + | + | + | - | + | - | + | + | - | - |
| - | - | + | + | + | + | - | + | - | + | + | - | - | - | - | - |
| - | - | + | + | + | + | - | + | + | - | + | - | + | - | + | + |
| - | - | + | - | + | - | + | - | + | - | - | + | + | + | - | - |
| - | + | + | + | + | + | + | + | + | - | + | + | - | + | + | - |
| + | - | + | - | + | + | + | + | + | - | + | - | + | - | - | - |
| - | - | + | - | + | - | + | + | + | - | + | - | - | - | + | + |
| - | + | + | - | + | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - |

*Дадатак 2*


Якабштадт
Ілукшта
Падубіс
Браслаў
Махірова
Полацк (Св.Сафіі)
Полацк (Св.Барыса і Глеба)
Сіроціна
Тадуліна
Паставы
Беразвеч
Віцебск
Ушачы
Дабрыгоры
Пустынкі (Віцебскія)
Любавічы
Лукомль
Чарэя
Вільня
Касута
Суцькаў
Баруны
Лагойск
Пустынкі (Мсціслаўскія)
Ануфрыева
Глушні
Ракаў
Мінск
Ляды
Гродна
Голдава
Лаўрышава
Малашкавічы
Чарлёна
Навагрудак
Марывіль
Мір
Новы Свержань
Вольна
Рагачоў
Дарава
Ятвеск
Цапра
Казімірава
Жыровічы
Лыскаў
Быцень
Ружаны
Гарадок
Скіток
Камянец
Сухавічы
Лепясы
Хомск
Новы Двор
Кобрын
Таракань
Мазыр (Ясная Гара)
Брэст
Лешча
Антопаль
Сялец
Белая
Вярхі
Люблін
Холм
Уладзімір
Жыдзічын
Турковічы
Дарагабуж
Дубна
Дзермань
Бучач
© Д.В.Лісейчыкаў
Манастыры Літоўскай правінцыі базыльянскага ордэна ў сярэдзіне XVIII ст.
Умоўныя пазначэнні:
манастыр
межы дзяржаў
Заўвагі: манастыр у Лепясах узгаданы толькі ў адной візітацыі 1737 г., манастыр у Любліне ўзгаданы толькі ў адной візітацыі 1739 г., пасля гэтага ён быў перададзены ў склад Рускай правінцыі ордэна, манастыр у Скітку ўзгаданы толькі ў адной візітацыі 1755 г., да Літоўскай правінцыі ордэна адносіўся манастыр у Рыме
Крыніца: Osterreichische Nationalbibliothek Nr. 2798, 2799, 3847, 3848, 3849

*Дадатак 3*



*Іл. 1.* Знешні выгляд кнігі пратаколаў за 1742–1747 гг.



Minscum 1736

*Іл. 2.* Пратакол візітацыі манастыра ў г. Мінску. 1736 г. Тытульны аркуш



Cathalogus Personarum Ordinis Sancti Basilij Magni in Provincia Tituli SSmae Trinitatis degentium

*Іл. 3.* **Cathalogus Personarum** – Спіс манахаў Літоўскай правінцыі базыльянскага ордэна за 1752 г. Тытульны аркуш

# ЗМЕСТ

**Прадмова** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3

Прывітальнае слова
да ўдзельнікаў канферэнцыі
дырэктара Нацыянальнага гістарычнагаархіва Беларусі
Яцэвіча Д. У.. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 6

Прывітальнае слова
да ўдзельнікаў канферэнцыі
дырэктара Інстытута гісторыі НАН Беларусі
Даніловіча В. В. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 7

**Секцыя І**
**Гісторыя архіўнай справы**

*Г. А. Бераставы*

Полацкія абласныя прывілеі
і прывілеі полацкім мяшчанам:
практыкі захоўвання і выкарыстання (XV–XVII стст.) . . . . . . . . 9

*З. В. Антановіч*

Вопісы спраў Магілёўскай рымска-каталіцкай
кансісторыі як крыніца па даследаванні
справаводства і архіўнай справы. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 20

*В. С. Пазднякоў*

Справы Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча ў 1835–1855 гг.:
цяжкае дваццацігоддзе . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 28

*Т. Ю. Афанасьева*

Архивный фонд рода Слизеней. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 33

*Т. Д. Гернович*

Первые нормативные акты об архивах БССР
(начало 1920-х гг.). . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 37

*С. В. Кулинок, М. Н. Скоморощенко*

К вопросу об организации делопроизводства
в Белорусском штабе партизанского движения
в сентябре–декабре 1942 г.. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 48

## Секцыя II
**Крыніцазнаўства: дакументы XIV–XIX стст.**

*Р. Б. Гагуа*

Акты мірнага дагавора ў Белзе ад 6 снежня 1392 г. як
гістарычная крыніца . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 59

*А. Б. Доўнар*

Прывілей Слуцку 1792 г. на правы «вольнага» горада . . . . . . . . . . . . . . . . 69

*Я. С. Глінскі*

Баяры Печуранскага войтаўства
ў XVIII – першай трэці XIX ст.. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 75

*О. А. Шуміліна*

Роль національних історичних архівів у вивченні творчої біографії
музикантів XVIII століття
(на прикладі життєтворчості Максима Березовського) . . . . . . . . . . . . . . 84

*А. У. Ерашэвіч*

Дакументы Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі
як крыніца аб падатках
і падаткаабкладанні на тэрыторыі Беларусі
(канец XVIII – першая палова XIX ст.) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 90

*С. В. Мяньчэня*

Сістэма яўрэйскіх малельных школ
і дамоў Віцебскай губерні
ў другой палове XIX – пачатку XX ст.
(паводле матэрыялаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі). . . .100

*Д. Ч. Матвейчык*

Метрычныя кнігі і спісы парафіянаў сібірскіх касцёлаў з фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі як крыніцы па гісторыі ссылкі ўдзельнікаў паўстання 1863–1864 гг. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .108

*О. В. Червинская*

Документы фондов учебных заведений Витебской губернии как генеалогический источник. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .117

*М. М. Кароль*

Праблематыка міжканфесійных пераходаў у другой палове XIX – пачатку XX ст.: перспектывы даследавання на матэрыялах Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .128

**Секцыя III**
**Крыніцазнаўства: дакументы XX ст.**

*С. Н. Рындин*

Борьба с «немецким засильем» в белорусских губерниях в годы Первой мировой войны (по материалам Национальных исторических архивов Беларуси в Минске и Гродно) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .134

*А. У. Дзьячкоў*

Дакументы Дзяржаўнага архіва Магілёўскай вобласці аб жыцці і дзейнасці артысткі і педагога Паўліны Мядзёлкі . . . . . . . . . .143

*Е. Г. Калечиц, А. В. Колосов*

Неизвестное научное наследие Константина Михайловича Поликарповича – новый источник для изучения палеолита беларуси и сопредельных регионов . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .148

*Т. Н. Агеенко*

Собирание и использование документов по национально-государственному строительству в Беларуси (по материалам архивного фонда «Институт истории партии и Октябрьской революции при ЦК КП(б)Б») . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .159

*Д. А. Дзядзюля*

Дзейнасць часовых органаў кіравання
на тэрыторыі Заходняй Беларусі
(верасень–снежань 1939 г.):
па дакументах Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь . . . . . . . . . . .163

*К. В. Сыцько*

Дакументы парафіяльных устаноў
рымска-каталіцкага касцёла ў Беларусі
другой паловы XX ст. як гістарычная крыніца . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .169

*М. М. Елинская*

Советские государственные награды –
Белорусской ССР, областям, городам . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .177

## Секцыя IV
**Беларусіка ў архівах замежжа**

*А. А. Жлутка*

Дакументы прамоцыі Францішка Скарыны
на доктара медыцыны з архіваў Падуі
і рэканструкцыя тэксту яго дыплома . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .191

*Д. В. Лісейчыкаў*

Матэрыялы генеральных візітацый манастыроў
Літоўскай правінцыі базыльянскага ордэна XVIII ст.
у фондах Аўстрыйскай нацыянальнай бібліятэкі . . . . . . . . . . . . . . . . . .197

*І. Б. Лаўроўская*

Касцёлы і кляштары Берасця Літоўскага XVII–XVIII стст.
у выбраных актах луцкіх і берасцейскіх біскупаў
з дыяцэзіяльнага архіва ў Седльцах. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .216

*Т. М. Заблоцкая*

Дакументы па гісторыі Ордэна піяраў
Літоўскай правінцыі
канца XVII – першай паловы XIX ст.
у архівах Беларусі, Літвы і Расіі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .228

*В. М. Папко*

Матэрыялы па гісторыі Беларусі XIX ст.
у Федэральным архіве г. Кобленца
і Цэнтральным архіве роду Гагенлоэ
ў Нойнштайне (Германія):
перспектывы даследавання і вяртання . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .236

*А. М. Сцебурака*

Падзеі 1812 г. у Беларусі ў святле французскіх дакументаў
Дзяржаўнага Імператарскага сакратарыята:
чаканні і рэчаіснасць. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .243

*Ю. М. Снапкоўскі*

Сямейны архіў мінскага губернатара Валерыя Чарыкава
ў Цэнтральным дзяржаўным архіве Самарскай вобласці . . . . . . . . . . . .247

**Секцыя V**
**Сучасныя архіўныя тэхналогіі**

*Г. С. Жолнеркевич*

Расширение доступа к документам
государственных архивов Республики Беларусь:
проблемы и пути решения . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .265

*Г. А. Сівохін, К. І. Мяцеліца*

Метадалагічныя аспекты рэалізацыі другой ступені сістэмы
адкрытага доступу да дакументаў нацыянальнага архіўнага фонду
Рэспублікі Беларусь . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .272

*А. М. Белявский, С. А. Захаркевич*

По ту сторону жизни:
антропологический анализ пространственной
семантики понятия «архив». . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .280

*В. С. Іванова*

Вусныя ўспаміны жыхароў беларускай вёскі
аб падзеях другой паловы XIX – пачатку XX ст. . . . . . . . . . . . . . . . . .294

*Н. С. Гардзіенка*

Да пытання экспертызы каштоўнасці дакументаў беларускай эміграцыі ў фондах Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва . . . . . . . . . . . . . . . . . . .306

*В. В. Боровик*

Музей-архив народной культуры Украинского Полесья: особенности формирования архивного фонда документов, найденных в брошенных населенных пунктах зоны отчуждения . . . . . .312

*В. В. Боровик, Г. А. Шамонин*

Некоторые вопросы архивного описания исследовательских собраний этнографических аудиодокументов и создания научно-справочного аппарата к ним . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .322

*О. В. Березовская*

Особенности описания архивной коллекции документов потерянных территорий чернобыльской зоны отчуждения . . . . . . . . . .331

*Ю. Б. Твердохлебова, Т. Г. Комлева*

Восполнение газетного фонда Национальной библиотеки Беларуси как необходимое условие обеспечения сохранности отечественного документного наследия. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .339

*Ю. І. Крыўдзюк*

Узаемадзеянне музеяў і архіваў у галіне захавання і прэзентацыі гісторыка-культурнай спадчыны . . . . . . . . . . . . . . . . . . .344

**Секцыя VI**
**Архіўныя дакументы і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны**

*Ю. М. Лаўрык*

Тэкставы склад зборніка КП 447 са збораў Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь . . . . . . . . . . . .351

*В. А. Кобринец*

К вопросу о русских монетных номиналах на территории Беларуси в XVI–XVII вв. (по данным письменных источников) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .357

*В. У. Шылай*

Да пытання атрыбуцыі і класіфікацыі вокладак актавых кніг XVII ст. з фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі . . . . . . . . . . . . .366

*В. В. Урублеўскі*

Зменлівасць беларускіх сялянскіх прозвішчаў у Мінскай губерні (канец XVIII – пачатак XX ст.) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .375

*І. Н. Колабава*

Матэрыялы Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі як крыніца па гісторыі фальшываманетніцтва . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .386

*С. А. Рыбчонак*

Матэрыялы з калекцыі графа Канстанціна Ажароўскага ў Нясвіжскіх зборах князёў Радзівілаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .390

*Ю. П. Латушкова*

Материалы по обращению бон Гомельского городского самоуправления из фондов Национального исторического архива Беларуси . . . . . . . . . .404

Звесткі пра аўтараў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .414